ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 32 (827) ● Чацвер, 11 лістапада 1971 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

**ВЕДЫ, ЭНЕРГІЮ, ТВОРЧАСЦЬ— ТАБЕ, РАДЗІМА!**

**ЗАЎТРА АДКРЫВАЕЦЦА XXIV СПРАВАЗДАЧНА - ВЫБАРНАЯ КАМСАМОЛЬСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ УНІВЕРСІТЭТА**

# ЗВЯРАЮЧЫ КРОК ПА ІЛЬІЧУ

**Незвычайна багатым на яркія, незабыўныя падзеі быў перыяд, які аддзяляе нас ад мінулай, XXIII камсамольскай канферэнцыі універсітэта: 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, 50-годдзе ЛКСМБ, XXIV з'езд КПСС і XXVII з'езд КПБ, XVI з'езд ВЛКСМ і XXIV з'езд ЛКСМ Беларусі.**

**Сёлетні навучальны год адзначан Усесаюзным злётам студэнтаў і вялікім святам навукі і культуры, якім стала 50-годдзе роднага універсітэта.**

**Гады, да якіх мы вяртаемся ў думках, унеслі ў жыццё новую форму работы — Усесаюзныя Ленінскія залікі, якія паднялі ініцыятыву кожнага камсамольца, узмацнілі яго імкненне звяраць свой кожны крок па Ільічу.**

**У 1970-71 годзе Ленінскі залік праходзіў пад знакам падрыхтоўкі да XXIV з'езда КПСС. Вынікі Ленінскага заліку наглядна дэманструюць узрослую актыўнасць амаль 10-тысячнай камсамоліі універсітэта. У цяперашні час да практыкі грамадскай работы прыцягнута 6 тысяч камсамольцаў, а па асобных факультэтах да 80 працэнтаў студэнтаў з'яўляюцца актывістамі. Выкананне асабістых абавязацельстваў прывяло да перамяшчэння цэнтра цяжару камсамольскай работы у групу. Вось чаму Ленінскі залік трывала ўвайшоў у жыццё універсітэцкага камсамола.**

**У параўнанні з 1969-70 навучальным годам значна ўзрасла паспяховасць студэнтаў, якая складае цяпер 91,7 працэнта, што на 2,3 працэнта вышэй мінулагодняга паказчыка. Амаль у паўтара раза павялічыўся лік студэнтаў-выдатнікаў.**

**Узрос таксама ўклад камсамола універсітэта і ў арганізацыю навукова-даследчай работы студэнтаў. Універсітэт прымае самы актыўны ўдзел ва ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсах. Так, 11 студэнтаў БДУ сталі лаўрэатамі Усесаюзнага конкурсу, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, а 5 з іх — уладальнікамі першай прэміі. Не вельмі часта здараецца, што 5 першых прэмій з 30 атрымліваюць студэнты адной вну.**

**Камсамольцы універсітэта вядуць шырокую прапагандысцкую работу. За год імі было прачытана больш 1000 лекцый. З асаблівай любоўю чыталіся студэнтамі лекцыі аб родным універсітэце, аб яго гісторыі і 50-гадовым шляху.**

**Далейшае развіццё атрымаў студэнцкі будаўнічы рух, які сёлета паклікаў на новабудоўлі Беларусі, Комі АССР, Казахстана, на самыя адказныя ўчасткі, дзе патрэбны задор і маладыя рукі, 1672 студэнты.**

**Байцамі студэнцкага будаўнічага атрада БДУ асвоена 2 мільёны 935.500 рублёў капіталаўкладанняў. Такі канкрэтны ўклад студэнтаў універсітэта ў выкананне гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС па далейшаму развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізму.**

**Заўтра адбудзецца XXIV камсамольская справаздачная канферэнцыя універсітэта. Безумоўна, што яе дэлегаты глыбока і ўсебакова абмяркуюць пытанні камсамольскай работы, выкажуць свае думкі і, зыходзячы з рашэнняў XXIV з'езда КПСС і XVI з'езда ВЛКСМ, вызначаць канкрэтныя задачы камсамольскай арганізацыі універсітэта на новы этап і не пашкадуюць сіл, каб з гонарам, па-камсамольску здзейсніць іх.**

# ЗЛЁТ СТУДЭНЦТВА:

## *ЗАДАЧЫ І ПРАБЛЕМЫ*

Дні Усесаюзнага злёту студэнтаў у Маскве назаўсёды застануцца ў памяці кожнага з удзельнікаў гэтага форума. Такое забыць немагчыма.

Успамінаю, як хваляваліся ўсе перад паездкай у сталіцу Радзімы. Як там усё будзе адбывацца? Такі ж злёт праводзіўся аж у 1928 годзе, але як мала тады было студэнтаў! Цяпер савецкае студэнцтва — перадавы атрад будаўнікоў камунізму, армія маладых, моцных, творачых у працы і навуцы.

І вось мы, прадстаўнікі двойчы ардэнаноснага камсамола Беларусі, у Маскве. Першы дзень прайшоў у чаканні «дня будучага». У час кароткай (па часе, а не па адлегласці) экскурсіі па Маскве пазнаёміліся з архітэктурай горада, яго мінулым і сённяшнім, пабывалі ў Дзяржаўным музеі мастацтваў імя Пушкіна. А на наступны дзень...

Раніца. Аўтобусы імчаць нас на Красную плошчу. Ідзем па тэрыторыі старажытнага Крамля ў Вялікі Крамлёўскі палац.

10 гадзін раніцы. Зала пасяджэнняў Вярхоўнага Савета СССР. У прэзідыуме з'яўляюцца кіраўнікі партыі і ўрада на чале з Генеральным сакратаром ЦК КПСС Л. І. Брэжневым. Цяжка перадаць урачыстасць гэтых мінут, вялікае хваляванне ўсіх удзельнікаў злёту. Доўга не змаўкаюць апладысменты. Першы сакратар ЦК ВЛКСМ Я. Цяжэльнікаў адкрывае злёт, удзельнікамі якога з'яўляюцца 2500 студэнтаў усіх вну нашай краіны.

Студэнт МДУ, ленінскі стыпендыят Валерый Чарнянкоў прапануе выбраць прэзідыум у складзе Палітбюро ЦК КПСС. Бурныя апладысменты ўдзельнікаў злёту гучаць як аднадушнае адабрэнне.

А пасля мы пачулі яркую, узрушаную прамову Леаніда Ільіча Брэжнева, звернутую да нас, студэнтаў. Гэта, безумоўна, была самая важ ная з лекцый, якую мы слухалі за студэнцкія гады. Часта не можа стрымаць гарачага парыву тэмпераментная студэнцкая аўдыторыя — доўга не змаўкаюць апладысменты. Леанід Ільіч гаварыў аб тых вялікіх задачах, якія неабходна рашыць савецкаму студэнцтву, успамінае, як цяжка было першым студэнтам Краіны Саветаў і студэнцтву, заваяваўшаму атэстаты мужнасці на палях бітваў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Уражліва прагучалі словы аб тым, што да канца бягучай пяцігодкі амаль кожны дзесяты грамадзянін СССР будзе мець дыплом аб заканчэнні вышэйшай або сярэдняй навучальнай установы. Навука цяпер развіваецца такімі тэмпамі, што многае нават з нядаўна *(Заканчэнне на 2-й стар.)*.

# З УЗНАГАРОДАЙ!

Напярэдадні 50-годдзя БДУ за выдатную вучобу, плённую працу ў камсамоле і актыўны ўдзел у студэнцкім будаўнічым руху ўзнагароджаны:

**Медалем «За працоўную доблесць»**

У. СІЛІН — намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта, начальнік штаба працоўных спраў пры камітэце камсамола універсітэта.

Л. ДАВЫДЗЕНКА — студэнт V курса гістарычнага факультэта.

**Граматамі Вярхоўнага Савета БССР**

У. РАСОХІН — студэнт III курса гістарычнага факультэта.

Г. ГАЛАЛОБ — студэнтка III курса хімічнага факультэта.

А. ДАРОХІН — студэнт IV курса фізічнага факультэта.

**Ганаровымі граматамі ЦК ВЛКСМ**

М. К. ГАРБАЧОЎ — сакратар парткома універсітэта.

П. СТАКРОЦКІ — студэнт III курса фізічнага факультэта.

В. ЕМЯЛЬЯНЕНКАЎ— інжынер кафедры электронных матэматычных машын, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

А. ДЗЕДУШКІН — член камітэта камсамола БДУ.

І. РАБЧЫНСКАЯ — стажор кафедры рускай мовы, сакратар камітэта камсамола філфака.

Г. ЦІХАНАВА — загадчык сектара ўліку камітэта камсамола універсітэта.

У. КУЗЬМІНАЎ — намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

В. КУШНЕР — былы намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.

Больш чым 30 студэнтам былі ўручаны Ганаровыя граматы ЦК ЛКСМ Беларусі. 1.200 камсамольцаў - актывістаў узнагароджаны юбілейнымі граматамі універсітэта.









Універсітэт святкуе Кастрычнік.

Фота М. Нечыпарэнкі.

# ГОД ПРАЦЫ

Справаздачы і выбары — асаблівы момант у жыцці кожнай камсамольскай арганізацыі, таму што гэта агляд нашай арганізаванасці, дзелавітасці, праверка актыўнасці кожнага камсамольца.

Наша работа праходзіла ў дні ўсенароднага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага гістарычнымі рашэннямі XXIV з'езда КПСС, і ў перыяд падрыхтоўкі да святкавання 50-гадовага юбілею універсітэта.

Аглядваючыся назад, хочацца ўспомніць асноўныя падзеі ў жыцці камсамольскай арганізацыі філалагічнага факультэта за прайшоўшы навучальны год і тыя вузлавыя пытанні, якія прыходзілася вырашаць камітэту камсамола. З пяці нарад камсамольскага актыву, якія адбыліся ў мінулым навучальным годзе, на наш погляд, найбольш удачнай была нарада «Аб задачах камсамольскай арганізацыі філфака ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС», на якой выступалі работнікі ЦК ЛКСМБ і нашы камсамольскія актывісты.

Вельмі карыснай і своечасовай была пастанова парткома універсітэта аб правядзенні ў кожнай групе сходаў «Студэнт БДУ — прыклад арганізаванасці, дысцыплінаванасці і культуры». У большасці груп і на курсах сходы прайшлі паспяхова. Пытанні ўнутранай і знешняй культуры звязваліся з канкрэтнымі задачамі вучобы і паводзін студэнтаў на факультэце.

З пачуццём глыбокага задавальнення можна сказаць, што ў перад'юбілейным для універсітэта годзе на факультэце значна ажывілася камсамольская работа.

Вось некаторыя прыклады і лічбы:

З 12 па 14 красавіка 1971 года праходзіла 28-я студэнцкая навуковая канферэнцыя, на якой ад філфака выступілі з дакладамі 93 студэнты.

На агляд навуковых студэнцкіх работ прадстаўлена каля 70 даследаванняў.

Павысілася паспяховасць студэнтаў у параўнанні з мінулай летняй сесіяй. Сярэдні бал па факультэту склаў 4,05.

Паспяхова здадзен Ленінскі залік. 100 камсамольцаў узнагароджаны ганаровым значком «Ленінскі залік».

Студэнтамі факультэта прачытана больш 200 лекцый па матэрыялах XXIV з'езда КПСС і аб юбілею універсітэта.

Тры студэнцкія будаўнічыя атрады філфака добра працавалі ў трэцім працоўным семестры.

Заваявана I месца ў агульнауніверсітэцкім аглядзе мастацкай самадзейнасці.

Гэта далёка не поўны пералік таго, што дасягнута.

Але сёння размова не толькі аб тым, што зроблена ў мінулым, але і аб задачах, якія стаяць перад арганізацыяй, і перш за ўсё аб Ленінскім заліку. Галоўны сэнс Ленінскага заліку камітэт камсамола бачыць у барацьбе за веды студэнтаў і павышэнні актыўнасці кожнага камсамольца. Гэта ўпаўне адпавядае тым асноўным напрамкам работы вну, якія былі вызначаны на Усесаюзным злёце студэнтаў: падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў і практычны ўдзел кожнага камсамольца ў справах арганізацыі.

І хоць Ленінскі залік на факультэце здадзен паспяхова, у радзе груп на першым этапе, калі прымаліся групавыя абавязацельствы, быў дапушчан фармалізм. У выніку не на належным узроўні прайшлі тут і заключныя сходы.

Уноў выбраны камітэт камсамола зрабіў крок для выпраўлення гэтага становішча. Распрацавана сістэма групавых заданняў па Ленінскаму заліку. Камсамольцы атрымалі магчымасць прымаць канкрэтныя абавязацельствы, зыходзячы з групавога задання. Добрых камсамольскіх спраў хапіла на ўсіх.

І. РАБЧЫНСКАЯ,
сакратар камітэта камсамола філфака.

# ЗЛЁТ СТУДЭНЦТВА:
## ЗАДАЧЫ І ПРАБЛЕМЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

знойдзенага, адкрытага нярэдка старэе перш, чым трапляе ў падручнікі і курсы лекцый. Таму неабходна пастаянна займацца самаадукацыяй.

З радасцю і усведамленнем клопатаў партыі і ўрада ўспрынялі ўдзельнікі злёту паведамленне аб рашэнні, якое прадугледжвае значнае паляпшэнне матэрыяльных і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў вну і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

**«Савецкі спецыяліст сёння — гэта чалавек, які добра авалодаў асновамі марксісцка-ленінскага вучэння, ясна бачыць палітычныя мэты партыі і народа, мае шырокую навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодае сваёй спецыяльнасцю».**

Самыя цёплыя словы былі сказаны аб нашых педагогах, вучоных. І адсюль зварот да нас, студэнтаў: «Будзьце ж дастойнымі сваіх настаўнікаў, сябры. Дайце ім вышэйшую радасць, якую можа адчуць настаўнік: усведамленне, што вучань пераўзышоў яго!»

З вялікім хваляваннем і гонарам слухалі мы словы Л. І. Брэжнева аб тым, што за выдатную вучобу, ударную працу, актыўную грамадскую дзейнасць усе ўдзельнікі злёту ўзнагароджаны Ленінскімі юбілейнымі медалямі.

У заключэнне Леанід Ільіч павіншаваў нас з гэтай высокай і заслужанай узнагародай і пажадаў выдатнай вучобы, здароўя, шчасця, вялікіх поспехаў у пачэснай справе служэння народу, вялікім ідэалам камунізму.

Медалі нам, прадстаўнікам Беларусі, уручылі ў Георгіеўскай зале Крамля міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў і другі сакратар ЦК ЛКСМБ У. В. Грыгор'еў.

З дакладам «Задачы вышэйшай школы на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва» выступіў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР В. П. Ялюцін. Нас уразілі лічбы: у дзевятай пяцігодцы будзе падрыхтавана 4,6 мільёна спецыялістаў з вышэйшай і 4,4 мільёна з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй ў 812 вну і 4250 тэхнікумах краіны.

Кожны новы крок у навуцы павінен знаходзіць сваё ўвасабленне ў навучальным працэсе. Вырасла патрэбнасць у спецыялістах па прыкладной матэматыцы. Нашы універсітэты прызваны адыграць сваю рашаючую ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў - выкладчыкаў па фундаментальных прадметах для спецыяльных вну (па матэматыцы, фізіцы).

Неад'емнай часткай навучальнага працэсу павінна стаць даследчая работа студэнтаў. Задача заключаецца ў тым, каб у бліжэйшыя 2—3 гады здзейсніць такое навучанне, каб кожны студэнт прайшоў школу даследавання і навуковага пошуку. Сучасны навукова-тэхнічны прагрэс патрабуе непарыўнай адукацыі.

Вялікае значэнне мае ўдзел студэнтаў у «трэцім семестры». За мінулую пяцігодку байцамі СБА асвоена 1,6 мільярда рублёў.

Асноўная мэта камсамольскіх арганізацый вну — дапамагчы ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Голас самой навукі пачулі мы ў дакладзе тройчы Героя Сацыялістычнай Працы, прэзідэнта Акадэміі навук СССР, акадэміка М. В. Келдыша, які адзначыў, што ў наш час нельга набыць спецыяльнасць на ўсё жыццё. Неабходна пастаяннае ўдасканаленне. Інжынеру цяпер патрэбна авалодаць фундаментальнымі навукамі — матэматыкай, фізікай. Вялікае значэнне мае прымяненне вылічальнай тэхнікі. М. В. Келдыш перадаў ад імя савецкіх вучоных усім удзельнікам злёту гарачае прывітанне і пажаданне творчых поспехаў.

З вялікай цікавасцю слухалі мы выступленне нашых равеснікаў з Масквы, Ленінграда, прадстаўнікоў саюзных рэспублік. Яны дзяліліся вопытам работы, гаварылі аб задачах і цяжкасцях.

Цудоўна выступіў на злёце студэнт гістарычнага факультэта нашага універсітэта Леанід Давыдзенка. Ён гаварыў ад імя тых, хто аднаўляў разбураную вайной Беларусь. Нам, беларусам, дзе кожная чацвёртая сям'я аплаквае загінуўшых у вайну блізкіх і родных, дзе на кожнай пядзі зямлі брацкія магілы і манументы, асабліва блізка і зразумела гераічная барацьба народаў В'етнама. На сродкі, заробленыя на нядзельніках, скамплектаваны «Карабель ударных атрадаў», які даставіць рыштунак і абсталяванне ўдарным атрадам моладзі ДРВ, Паўднёвага В'етнама, Лаоса і медыкаменты для дзяцей Ханоя.

Удзельнікаў злёту, пайшоўшых па шляху навукі, ад імя пакалення ветэранаў вітаў двойчы Герой Савецкага Саюза, Маршал Савецкага Саюза І. С. Конеў. Праслаўлены военачальнік перадаў у падарунак студэнтам-камсамольцам дарагую яму рэліквію — фатаграфію дэлегатаў X з'езда партыі, удзельнічаўшых у падаўленні Кранштацкага мяцяжу, зазнятых разам з У. І. Леніным.

Асабліва запомнілася мне выступленне Героя Сацыялістычнай Працы, акадэміка АН СССР, рэктара МВТВ імя Баумана Г. А. Нікалаева. Чалавеку, вучонаму, многа год аддаўшаму рабоце са студэнтамі, як нікому зразумелы задачы і праблемы студэнтаў, неабходнасць зліцця вучэбнага і навуковага працэсу, праца калектывам.

Студэнтам-актывістам неабходна:

— прыцягваць як можна больш студэнтаў да навуковай працы;

— адшукваць таленты для будучай навуковай працы, для выкладання;

— спалучаць тэорыю з практыкай, навуку з вытворчасцю: «Чытайце кнігі, якія напісаны лепшымі людзьмі»;

— выпрацоўваць валявыя якасці: мужнасць, волю, настойлівасць: «Займайцеся фізкультурай: фізкультурнікі — выдатныя студэнты. Няхай кожны стане воласам у параўнанні з самім сабой. Паважайце старэйшых, карыстаючыся самастойнасцю».

Ад імя студэнтаў-спартсменаў, пачынаючых і ўжо заслужаных, выступіла Галіна Гарохава, аспірантка, чэмпіёнка свету і Алімпійскіх гульняў па фехтаванні на рапірах.

Добры наказ прагучаў у словах паэта Аляксея Суркова.

...Вось і апошняе выступленне. Аднадушна прынялі ўдзельнікі злёту пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС. Злёт аб'яўляецца закрытым. Гучыць «Інтэрнацыянал», а пасля студэнты спяваюць «Песню аб трывожнай маладосці».

Усе ўдзельнікі злёту наведалі Маўзалей У. І. Леніна.

Запомніцца мне надоўга паездка ў МДУ, дзе на мехмаце перад удзельнікамі злёту выступіў акадэмік Аляксандраў, запомніцца ўсім канцэрт для дэлегатаў з удзелам студэнтаў-лаўрэатаў міжнародных і ўсесаюзных конкурсаў, выступленне кампазітара Аляксандры Пахмутавай, паэта Сяргея Нараўчатава.

Назаўсёды застануцца ў памяці цёплыя гутаркі з масквічамі, студэнтамі-карабеламі з Ленінграда, прадстаўнікамі Літвы і Узбекістана, падараваныя імі значкі, сувеніры.

Вялікага поспеху вам, сябры! Няхай злёт-71 будзе добрай школай у справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў — сапраўдных будаўнікоў камунізму.

В. БАЛАШЧАНКА,
сакратар камітэта камсамола матфака.





ВЫДАТНІКІ ВУЧОБЫ. Таня ЖУК (філфак). Пётр КРАВЧАНКА (гістфак).

ШТО ГЭТА за чалавек, ленінскі стыпендыят? Ці склад у яго асаблівы, ці здольнасці незвычайныя? А, магчыма, ён ведае сакрэт, як усюды паспець, усюды быць першым?

— Здольнасці працай дасягаюцца. Першы свой клас я два гады праходзіў, — расказвае Леанід Давыдзенка, ленінскі стыпендыят, дэлегат Усесаюзнага злёту студэнтаў. — Перавярнулася тады штосьці ва мне. Выплакаў я гэта і ўзяўся за вучобу. З таго часу заўсёды толькі пяцёркі атрымліваў. І ў школе, і ў тэхнікуме, і ва універсітэце.

Ёсць у англійскага філосафа Фрэнсіса Бэкана цудоўныя словы: «У кожным чалавеку прырода ўзыходзіць ці злакам, ці пустазеллем. Няхай жа ён своечасова палівае першае і выкараняе другое». І чым раней пачнем мы выкараняць у сабе пустазелле, тым больш глебы застанецца для злакаў. Таму вельмі важна, калі ў пачатку шляху нашага сустрэнуцца людзі, якія дапамогуць нам у гэтым. У Хляўнянскай школе Кармянскага раёна, дзе вучыўся Леанід, такія людзі знайшліся. Анастасія Пятроўна Кавальчук здолела на ўсё жыццё захапіць матэматыкай. Ганна Савельеўна Сотнікава дапамагла палюбіць беларускую літаратуру і родны край. («Новая зямля» Якуба Коласа і цяпер любімая кніга Леаніда: «Я яе і хлопцам на эсмінцы, дзе службу праходзіў, чытаў»). Пётр Канстанцінавіч Старасценка, дырэктар школы, выкладчык гісторыі і геаграфіі зацікавіў пытаннямі грамадскага жыцця.

І, бадай, яшчэ школьныя гады прадвызначылі любоў Леаніда Давыдзенкі да палітычнай эканоміі (ён студэнт 5 курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта), якая патрабуе ад чалавека шырокіх, глыбокіх і рознабаковых ведаў. Прадвызначылі. Але па-сапраўднаму палюбіў ён гэту навуку ўжо студэнтам Мінскага фінансава-эканамічнага тэхнікума. За што?

— За тое, што яна дапамагае глыбей зразумець навакольны свет.

Чаму ж тады, так рана вызначыўшы сваё прызванне (ужо ў тэхнікуме), Леанід

# ФОРМУЛА ЖЫЦЦЯ
## ЧАС ВУЧЫЦЦА, ЧАС ВУЧЫЦЬ

не паступаў у вну (у яго ж быў дыплом з адзнакай)? Чаму паехаў па накіраванню ў Пружаны — эканамістам райфінаддзела? А таму, што лічыў: трэба яшчэ павучыцца ў жыцця.

— Жывая палітэканомія,— усміхаецца Леанід.

Год у райфінаддзеле і час службы на Чарнаморскім флоце не прайшлі бясследна. Яны навучылі разбірацца ў чалавечых узаемаадносінах, пранікаць у псіхалогію людзей. Увесь гэты час Леанід сур'ёзна і многа чытаў. Скончыў аднагадовую вячэрнюю партыйную школу, быў сакратаром камітэта камсамола. На флоце і ў партыю ўступіў.

Умець вучыцца — гэта ж не толькі ўмець назіраць, вылучаць галоўнае, засвойваць. Гэта яшчэ — і ўмець выкарыстоўваць свае пазнанні, каб яны не драмалі, як гаворыць Леанід. Здавалася б: вялікі перапынак паміж тэхнікумам і універсітэтам, многае забыта — цяжка зноў вучыцца, ды яшчэ не абы-як, а выдатна. Але ў тым жа і ўся справа, што трывалыя веды, атрыманыя раней, паслужылі зарукай поспеху цяперашняму. Як Леанід вучыцца ў вну?

— Рыхтуюся да кожнага семінара (нават калі не збіраюся выступаць). Рыхтуюся і да лекцый: прачытваю папярэдні матэрыял па канспекту ці падручніку: каб прыгадаць, аб чым размова ідзе. Сакрэт невялікі: шлях да поспеху ляжыць праз сістэматычныя заняткі. Але магчыма гэта толькі тады, калі работа не становіцца цяжарам, калі ў штодзённым пошуку знаходзіш радасць. А я знаходжу.

— Лёня так плануе свой дзень, што на ўсё хапае часу. І па дому дапамагчы (мы ж абое вельмі занятыя). І з Алёнкай пазаймацца, — расказвае Таня, жонка Леаніда.

З першага ж курса Леанід Давыдзенка актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці універсітэта. Ён і намеснік сакратара камітэта камсамола, і член Таварыства савецка-балгарскай дружбы, і нязменны староста групы, і камандзір інтэрнацыянальнага будаўнічага атрада. Ці не занадта для аднаго чалавека?

— Спецыфіка маёй будучай прафесіі менавіта ў тым, каб грамадства вывучаць. Ну а грамадская работа — першы ў гэтым памочнік. І потым — адчуваю: мне ўжо ёсць што аддаваць людзям.

Гэта, перш за ўсё, вопыт старэйшага таварыша. Невыпадкова на працягу некалькіх гадоў яму давяралі такія адказныя пасады, як камандзір атрада «Йена-69», што працаваў у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, як начальнік штаба Уральскага абласнога будаўнічага атрада, як камісар Мінскага гарадскога будатрада.

А давер'е абавязвае. Леанід прыгадвае, як цяжка было пачынаць працаваць ва Уральскай вобласці. Састаў атрада быў вельмі разнашэрсны — з розных гарадоў, — і таму байцоў сваіх вывучыць не паспелі. Нялёгка было і з транспартам, і з будматэрыяламі. Ад таго, ці зможа штаб зладжана, прадуктыўна працаваць, вельмі многае залежала. І Леанід дабіўся гэтага: у штабе ўстанавілі кругласутачнае дзяжурства (каб у любую хвіліну можна было прыйсці на дапамогу сваім атрадам), пачалі праводзіць штотыднёвыя планёркі, імкнуліся наладзіць добрую арганізацыю працы ў рабоце штаба.

А ў выніку беларускі будаўнічы атрад быў прызнан адным з лепшых, што працавалі ва Уральскай вобласці.

За грамадскую работу, за выдатную вучобу Леанід Давыдзенка неаднаразова быў узнагароджан граматамі райкомаў, гаркомаў, абкомаў камсамола. Адзначан ён таксама граматамі ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ. Ёсць у яго і дзве ўрадавыя ўзнагароды: медаль «За працоўную адзнаку» і Ленінскі юбілейны медаль.

— Усім, чаго дасягнуў, што ў мяне ёсць, я абавязан Савецкай уладзе, нашай партыі, камсамолу, — гаворыць Леанід. — Без гэтага ці змог бы я, сын вясковага каваля, у якога сям'я была з 16 чалавек, пайсці вучыцца, атрымаць вышэйшую адукацыю.

Цяпер прыйшоў час аддаваць людзям веды, уменне, вопыт, якія накоплены за гады працы і вучобы.

Г. ПШОНІК.

# 150 год з дня нараджэння Ф. М. Дастаеўскага

# АПОСТАЛ ГУМАНІЗМУ

Адзін з буйнейшых у свеце мастакоў слова, Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі быў, напэўна, найбольш складаным і самым супярэчлівым пісьменнікам, публіцыстам і філосафам. У. І. Ленін адзначаў у творчасці Дастаеўскага наяўнасць вастрэйшых «супярэчнасцей, паломаў» і ў той жа час высока цаніў створаныя ім «жывыя карціны рэчаіснасці». М. Горкі лічыў, што па сіле мастацкага адлюстравання Дастаеўскі «роўны, мабыць, толькі Шэкспіру», але, прызнаючы бясспрэчную геніяльнасць Дастаеўскага, не пераставаў змагацца супраць рэакцыйнасці некаторых яго ідэй. У гэтай складанасці і супярэчлівасці пісьменніка — цяжкасць разумення і ўспрыняцця яго багатай літаратурнай спадчыны.

Як чалавек і як творчая індывідуальнасць Дастаеўскі фарміраваўся ў цяжэйшую, пераломную эпоху, якая наступіла пасля разгрому дзекабрыстаў. Расія стагнала тады пад ігам прыгонніцтва і паліцэйскага тэрору, была забітай і падаўленай. Толькі ў самых глыбокіх яе нетрах, у народных нізах, наспявалі пратэст і абурэнне, якія аказвалі рэвалюцыянізуючае ўздзеянне на настрой думак лепшых людзей Расіі. Перадавая моладзь, захопленая тэорыямі утапічнага сацыялізму, горача прапагандавала ідэі сацыяльнай роўнасці, свабоды і чалавечага братэрства. Да саракавых гадоў выкрышталізаваліся рэвалюцыйна-дэмакратычныя перакананні Бялінскага, да голасу якога прыслухоўвалася ўся прагрэсіўная Расія, у тым ліку і малады Дастаеўскі.

Вырасшы ў сям'і ўрача маскоўскай «бальніцы для бедных», Дастаеўскі з дзяцінства быў сведкам пакутлівых драм у асяроддзі прыдаўленых прыгонным рабствам простых людзей. З пераездам у 1837 годзе ў Пецярбург ён аказаўся на становішчы паўгаладнага разначынца, спазнаў нястачу і ўніжэнне сваёй чалавечай годнасці. Яго асабісты жыццёвы вопыт, яго назіранні над непрыглядпай рэчаіснасцю давалі багаты матэрыял для мастацкай творчасці.

У сваім першым творы — рамане «Бедныя людзі» (1846 г.) — Дастаеўскі з вялікай сілай раскрыў трагізм лёсу гарадскіх беднякоў, бяспраўных, галодных і забітых, глыбока раскрыў сацыяльны антаганізм, паказаў, як у страшэнна багатым горадзе бязмерна мучацца і часта гінуць тысячы беднякоў, душэўна чыстых, высакародных, чалавечных, такіх, як маленькі чыноўнік Дзевушкін, асірацеўшая Варанька, хворы чахоткай студэнт Пакроўскі. Малады пісьменнік выступіў выкрывальнікам нягодніцтва ўласніцкага грамадства і ў абарону зганьбаваных правоў чалавека, з'явіўся пяўцом уніжаных і абяздоленых, выразнікам ідэй гуманізму і сацыяльнай роўнасці. «Самы забіты, апошні чалавек ёсць таксама чалавек і называецца брат мой», — так ён вызначыў галоўную думку свайго рамана. Раман гэты з захапленнем вітаў Бялінскі: «Гонар і слава маладому паэту, муза якога любіць людзей на паддашніках і ў падвалах!..» Дастаеўскі паўстаў перад сучаснікамі як вучань Гогаля, наследнік яго традыцый, самабытны мастак крытычнага рэалізму.

Асабістае знаёмства ў 1845 годзе з Бялінскім і яго асяроддзем выклікала ў маладога Дастаеўскага моцнае, глыбокае ўражанне, і ён гатоў быў заявіць: «Я заслужу, пастараюся стаць такім жа цудоўным, як яны, буду «верным»!.. у іх адных ісціна, а ісціна, дабро, праўда заўсёды перамагаюць загану і зло». Дастаеўскі сапраўды хацеў быць з тымі, хто змагаецца ў імя перамогі чалавечай праўды і справядлівасці. Яго захапілі ідэі утапічнага сацыялізму. У 1847 годзе ён зблізіўся з гуртком Петрашэўскага, прыняў жывы ўдзел у абмеркаванні пытанняў аб шляхах развіцця Расіі. На пасяджэнні гуртка чытаў славутае пісьмо Бялінскага да Гогаля, названае Леніным лепшым творам бесцэнзурнага дэмакратычнага друку. Быў добра асвядомлены аб намерах петрашэўцаў стварыць друкарню для выдання нелегальнай літаратуры.

Нечакана-трагічны паварот у жыцці Дастаеўскага адбыўся вясной 1849 года: паследаваў разгром гуртка петрашэўцаў. Быў арыштаван і Дастаеўскі. Яго прыгаварылі да смяротнай казні. Разам з петрашэўцамі ён, па яго словах, перажыў «жудасныя, бязмерна страшныя хвіліны чакання смерці». Ці мучылі яго пачуцці раскаяння? Не. Ён пасля пісаў: «Тая справа, за якую нас асудзілі, тыя думкі, тыя паняцці, якія валодалі нашым духам, уяўляліся нам не толькі не патрабуючымі раскаяння, але нават нечым нас ачышчаючым, пакутніцтвам, за якое многае нам даруецца...» На шчасце, смяротная кара не адбылася: у апошнюю мінуту яна была заменена катаргай і ссылкай.

Пяць год катаргі і затым пяць год ссылкі... Гэта дзесяцігоддзе моцна надламала Дастаеўскага. У Омскім астрогу ён на сабе адчуў варожыя адносіны катаржан да яго, учарашняга сацыяліста, і гэта прывяло яго да памылковага заключэння, што народным масам увогуле далёкія ідэі сацыялізму і рэвалюцыі, што рэвалюцыянеры ў вачах народа — гэта адшчапенцы грамадства, слабыя і бездапаможныя адзіночкі. Праўда, Дастаеўскі і ў няволі беражліва захоўваў свае юнацкія мары аб чалавечым шчасці, аб велічнасці прынцыпаў свабоды і неабходнасці роўнасці для ўсіх людзей зямлі; скрозь катаргу ён пранёс і сваю глыбокую нянавісць да тых, хто асудзіў мільёны людзей на гаротнасць і пакуты. Гэтым пачуццям, ідэям і настроям ён заставаўся верны заўсёды. Але пасля катаргі ў ім была канчаткова пахіснута вера ў рэальную магчымасць і правамернасць рэвалюцыі ў Расіі. Калі ў 1859 годзе настаў час вяртання з ссылкі, Дастаеўскі аказаўся на ідэалагічным раздарожжы. Яго творы гэтага пераходнага перыяду працягвалі лінію «Бедных людзей», былі тэматычна звязаны з гэтым раманам. Гуманістычным пафасам былі авеяны аўтабіяграфічныя «Запіскі з Мёртвага дома» (1861), якія раскрывалі страшную праўду аб царскай катарзе, дзе марна гінулі тысячы чалавечых жыццяў. Вобраз Мёртвага дома быў успрынят як сімвал самадзяржаўнай Расіі. У рамане «Уніжаныя і зняважаныя» пісьменнік з болем і гневам расказваў аб лёсе зняважанага Іхменева, аб няшчаснай Нэлі і яе маці, аб ганебных злачынствах князя Валкоўскага, увасабляўшага злачынны свет эксплуатацыі і насілля.

Аднак узмацненне ў краіне палітычнай рэакцыі, якое выявілася ў расправе над Чарнышэўскім і Пісаравым, у ганеннях на рэвалюцыянераў, у рэпрэсіях супраць някрасаўскага «Современника» і ўсяго дэмакратычнага друку, вызначыла ідэйную і літаратурную пазіцыю Дастаеўскага: ён прымкнуў да лагера ворагаў рэвалюцыі. З сярэдзіны 60-х гадоў у яго творчасці яўна гучалі матывы адмовы ад актыўнай барацьбы і рэвалюцыйнага пратэсту. Так, герой кнігі «Запіскі з падполля» (1864), жорстка нападаючы на рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў, спрабуе апраўергнуць матэрыялістычную філасофію і вучэнне сацыялістаў, гаворыць аб бессэнсоўнасці рэвалюцыі і немагчымасці пабудовы гарманічнага сацыялістычнага грамадства. Новым людзям з рамана Чарнышэўскага «Што рабіць?» Дастаеўскі супрацьпаставіў тут свавольнага і раззлаванага індывідуаліста, ва ўсім расчараванага анархічнага парадаксаліста.

Было б, аднак, памылкова думаць, што Дастаеўскі з гэтай пары адказаўся ад добраахвотна ўзятай на сябе місіі абаронцы уніжаных і зняважаных, перастаў быць бытапісальнікам трушчоб і цёмных гарышчаў. Не, ён, як і раней, будзе апісваць змрочныя гісторыі, якія—па яго ж словах — «так часта і непрыкметна, амаль таямніча, збываюцца пад цяжкім пецярбургскім небам, у цёмных, затоеных закавулках вялікага горада, сярод узбаламучанага кіпення жыцця, тупога эгаізму, сутыкаючыхся інтарэсаў, змрочнай разбэшчанасці, патаемных злачынстваў, сярод усяго гэтага сапраўднага пекла бессэнсоўнага і ненармальнага жыцця».

Але цяпер перад намі як бы два Дастаеўскія: адзін з непадробленай сардэчнасцю мучыцца пры відзе бязмежнасці народжаных буржуазным грамадствам людскіх пакут і разам са сваімі героямі абураецца жыццём, крычыць ад нясцерпнага болю; другі, гаворачы аб непазбежнасці мук у сучасным свеце, гатоў прызнаць іх ачышчальную сілу, кліча да цярпення і пакорлівасці.

У 1866 годзе з'явіўся раман «Злачынства і пакаранне» — лепшы мастацкі твор Дастаеўскага. Тут многа жудаснай праўды аб парэформеннай буржуазнай рэчаіснасці, да канца раскрыты сацыяльныя супярэчнасці нараджаўшагася капіталістычнага грамадства. Кабатчык, гаспадар піўной, трактыршчык, «злое насякомае» бабка-працэнтшчыца, купец Вахрушаў, ранцье, які стрыжэ купоны, халодна-беражлівы Лужын, вялікі цынік Свідрыгайлаў—у гэтых вобразах Дастаеўскі тыпізаваў ненавісны яму самому свет уласнікаў-павукоў, якія смокчуць з народа кроў. На другім полюсе грамадства—замучаныя непасільнай працай і вечнай нястачай, знерваваныя і хворыя, зусім бяспраўныя і безабаронныя ахвяры капіталу, чыноўнік Мармеладаў, Кацярына Іванаўна, Сонечка і Дуня, былы студэнт Раскольнікаў, чарада безымянных чалавечых фігур. Так, тут абмаляваны сапраўды ашаламляльныя карціны нечуванага жабрацтва, прастытуцыі, абуральнай беззаконнасці, прыгнёту чалавека чалавекам.

Праўда, сказаная раманам Дастаеўскага, нараджала і нараджае ў душы чытача прагу дзейснай барацьбы супраць грамадства і дзяржавы, заснаваных на абкрадванні і эксплуатацыі народных мас.

Але з верных назіранняў і фактаў, адлюстраваных у вобразах вялікай мастацкай сілы, Дастаеўскі рабіў памылковы вывад аб немагчымасці, бессэнсоўнасці якога б там ні было пратэсту. Асудзіўшы індывідуалістычны «бунт» Раскольнікава, пісьменнік увогуле адмаўляў насільныя метады перабудовы грамадскага жыцця, асуджаў рэвалюцыю. Вуснамі Сонечкі Мармеладавай выказана ў рамане рабская мараль змірэння перад магутнасцю зла. Гэтую думку Дастаеўскі яшчэ больш энергічна бярэ пад абарону ў рамане «Ідыёт» (1868). У галоўным героі князю Мышкіне пісьменнік імкнуўся ўвасобіць свой ідэал чалавека — пакорлівага, нязлога і лагоднага, які ўсё даруе і дзейнічае ў духу любві. Але памылковыя ідэі Мышкіна і, значыць, ідэі аўтара прыходзілі ў страшэнную супярэчнасць з праўдай жыцця. Катастрофа, якой абрываецца жыццё гэтага «праведніка», толькі ярчэй адцяняла дарэмнасць спроб хрысціянскімі павучэннямі змяніць да лепшага змрочную буржуазную рэчаіснасць.

Сваіх палітычных антаганістаў — прадстаўнікоў рэвалюцыйнага падполля ў Расіі — Дастаеўскі часцей за ўсё раскрываў аднабакова, тэндэнцыёзна. Так абмаляваны «нігілісты» ў рамане «Ідыёт» (Іпаліт, Келер, Бурдоўскі). Вядома, тыя, каго ён выводзіў пад імем нігілістаў, менш за ўсё нагадвалі рыцарскі бясстрашных рэвалюцыянераў, выхаваных на ідэях Бялінскага, Чарнышэўскага, Дабралюбава, а выглядалі амаральнымі суб'ектамі або нават крымінальнымі асобамі. У выглядзе шайкі злачынцаў і авантурыстаў паказаны рэвалюцыянеры-падпольшчыкі ў рамане «Нячысцікі» (1871), скажона паказваючага вызваленчы рух у Расіі.

У сваім апошнім, самым вялікім эпічным творы — рамане «Браты Карамазавы» (1880) Дастаеўскі зноў разгарнуў тэму трагічнага лёсу чалавека ва ўласніцкім свеце, ва ўвесь рост паставіў злабадзённыя пытанні аб шляхах выратавання абяздоленых ад жахаў нястачы, аб рэлігіі і атэізме, аб сацыялізме і рэвалюцыі, аб будучыні Расіі і рускага народа. Дзе выйсце: у рэвалюцыі ці рэлігіі? У нянавісці да палачоў ці ў евангельскім дараванні?

Намаляваныя Дастаеўскім «жывыя палотны рэчаіснасці» гаварылі аб тым, што няма і не можа быць апраўдання і даравання палачам і прыгнятальнікам за здзекі над чалавекам. Аднак Дастаеўскі, у супярэчнасці з самім сабою, насуперак інтарэсам тых, лёс якіх не даваў яму ні хвіліны спакою, у «Братах Карамазавых» зноў кліча да ўседаравання, не прымае рэвалюцыі, прапаведуе «сацыялізм у Хрысце», апраўдвае рэлігію і пацвярджае ідэал «дзяржавы-царквы».

Так усё сваё свядомае жыццё Дастаеўскі біўся ў нераце невырашальных для яго ідэйных, палітычных і філасофскіх супярэчнасцей, народжаных антаганістычнымі супярэчнасцямі рускай гістарычнай сапраўднасці. Бясстрашны ў сваёй крытыцы заганаў і язваў буржуазна-памешчыцкага грамадства, вечна мяцежны, неспакойны мастак-бунтар, гуманіст і дэмакрат, Дастаеўскі, аднак, быў бяссільны даць правільны адказ на цяжкае для яго пытанне—як і хто выратуе жорстка эксплуатуемыя народныя масы ад нечуваных здзекаў, нястачы і рабства? Гэтае вялікае пытанне было вырашана самім народам у кастрычніку 1917 года.

Вакол літаратурнай спадчыны геніяльнага мастака слова і вялікага мысліцеля здаўна ідзе і да гэтага часу не спыняецца бязлітасная ідэалагічная барацьба. Ідэолагі імперыялістычнай рэакцыі, спекулюючы імем найвялікшага з пісьменнікаў XIX стагоддзя, усяляк раздуваюць і аднабакова перабольшваюць найбольш слабыя бакі яго ідэйна-мастацкай спадчыны, падымаюць на шчыт якраз тое, што ў сапраўднасці з'яўлялася «гістарычным грэхам» і заблуджэннем гэтага складанага мастака і мысліцеля.

Для нас жа Дастаеўскі — творца бяссмяротных мастацкіх твораў, якія ўзбагацілі рускую і сусветную літаратуру, геніяльны пісьменнік крытычнага рэалізму, які няспынна выкрываў законы і звярыную мараль капіталістычнага грамадства, мастак, які праўдзіва і глыбока раскрыў трагедыю прыгнечаных мас, сапраўдны гуманіст, прыхільнік сацыяльнай справядлівасці, тонкі знаўца і даследчык чалавечай душы, выдатны прадстаўнік рускай культуры, волат у радзе другіх волатаў сусветнага мастацтва слова.

**Ф. КУЛЯШОЎ,**
**доктар філалагічных навук, прафесар.**

# У ГЛЫБІНІ ТВОРЧАСЦІ

Творчасць Ф. М. Дастаеўскага — адна з самых супярэчлівых і складаных з'яў рускай літаратуры XIX стагоддзя. Шлях да глыбокага і вернага разумення праблематыкі, гістарычнага сэнсу твораў гэтага пісьменніка больш працяглы і цяжкі, чым шлях да засваення спадчыны Пушкіна, Гогаля або Л. Талстога. Таму вывучэнню Дастаеўскага на філалагічным факультэце БДУ ўдзяляецца вялікая ўвага. Будучаму выкладчыку рускай літаратуры неабходна не толькі самому, не парушаючы і не спрошчваючы супярэчлівага цэлага, пранікнуць у багаты свет вялікага пісьменніка, але і навучыць гэтаму сваіх вучняў. Настаўніку-славесніку яшчэ са студэнцкай парты трэба цвёрда разумець, што адзіна правільнае, навуковае «прачытанне» любога пісьменніка магчыма толькі з пазіцый марксісцка-ленінскай метадалогіі. Тым больш, калі размова ідзе аб Дастаеўскім, з твораў якога нярэдка ворагі сацыялізму чэрпалі ў мінулым і працягваюць чэрпаць у нашы дні аргументы для барацьбы з прагрэсіўнай перадавой думкай.

Важнейшай навукова-тэарэтычнай падмогай пры вывучэнні творчасці Дастаеўскага для студэнтаў-філолагаў з'яўляюцца лекцыі выкладчыкаў кафедры рускай класічнай літаратуры (прафесара Ф. І. Куляшова, дацэнта П. І. Ткачова і іншых). Самастойнаму праблемнаму аналізу яго твораў, засваенню пытанняў майстэрства, прыроды рэалізму і дэмакратызму, метадаў і прыёмаў псіхалагічнага аналізу і г. д. студэнты вучацца ў розных семінарах, пры выкананні дыпломных і курсавых работ.

З году ў год прафесарам Ф. І. Куляшовым вядуцца практычныя заняткі па найбольш складанаму і цяжкаму для засваення раману «Браты Карамазавы». Тут студэнты выступаюць з дакладамі, у якіх разглядаюцца ідэйна-філасофскі змест, пытанні жанравай асаблівасці, стылю і экранізацыі гэтага твора.

Трэба адзначыць, што тэматычнае вывучэнне Дастаеўскага за апошнія гады ў нас на філалагічным факультэце значна пашырана і абноўлена. Так, напрыклад, толькі ў мінулым навучальным годзе пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры рускай класічнай літаратуры студэнтамі аддзялення рускай мовы і літаратуры падрыхтавана і паспяхова абаронена больш дзесяці дыпломных і курсавых работ, прысвечаных Дастаеўскаму. Сярод іх выдзяляюцца такія арыгінальныя даследаванні, як «Мастацкая ўмоўнасць у прозе Дастаеўскага» В. Крывіцкага, «Крытыка буржуазных тэорый выключнай асобы ў «Злачынстве і пакаранні» і «Братах Карамазавых» Т. Чайко, «Фантастыка адлюстравання вобразаў у рамане «Ідыёт» Л. Кушнер, «Тэма інтэлігенцыі і народа ў «Запісках з Мёртвага дома» Л. Шчукі і іншыя. Характэрна ў гэтай сувязі і другое. Умелы падбор тэматыкі садзейнічае сканцэнтраванню ўвагі студэнтаў не толькі на вывучэнні Дастаеўскага ў літаратурным асяроддзі сваёй эпохі, але і на ўплыве яго творчасці на далейшы рускі і сусветны літаратурны працэсы. Ужо ў гэтым навучальным годзе студэнтам своечасова прапанаваны наступныя цікавыя тэмы: «Дастаеўскі і Някрасаў», «Горкі і Дастаеўскі», «Леанід Андрэеў і Дастаеўскі», «Дастаеўскі і экзістэнцыялізм XX стагоддзя».

Вывучаюцца традыцыі Дастаеўскага і ў беларускай літаратуры. Напрыклад, некалькі год запар у гэтым напрамку плённа працуе спецсемінар «Дастаеўскі і Кузьма Чорны», якім кіруе прафесар А. М. Адамовіч.

**В. СТАЛЬМАХОЎ,**
**аспірант кафедры рускай класічнай літаратуры.**

## ● ПРЫСВЕЧАНЫ ДАСТАЕЎСКАМУ

**Сёння ў актавай зале галоўнага корпуса адбудзецца вечар, прысвечаны 150-годдзю з дня нараджэння Ф. М. Дастаеўскага.**

**З уступным словам выступіць народны пісьменнік БССР Міхась Лынькоў.**

**Даклад «Жыццё і творчасць Ф. М. Дастаеўскага» прачытае доктар філалагічных навук І. Я. Навуменка.**

**Госці — артысты Бабруйскага драматычнага тэатра пакажуць спектакль па раману Ф. М. Дастаеўскага «Ідыёт».**

# ВЯЛІКАЯ ПАМОЧНІЦА—НАГЛЯДНАСЦЬ

Калектыў выкладчыкаў ваеннай кафедры многа сіл і старання аддае лепшай падачы вывучаемых студэнтамі дысцыплін. З гэтай мэтай выкарыстоўваецца ўвесь арсенал метадычных прыёмаў, вялікае месца адводзіцца нагляднасці выкладаемага матэрыялу, адшуканню магчымасці прымянення на лекцыі тэхнічных сродкаў навучання.

Формы нагляднасці ўключаюць: схемы, графікі, вычэрчваемыя выкладчыкам на дошцы; схемы, графікі, табліцы, чарцяжы ў выглядзе плакатаў; узоры канструкцый; разразныя вузлы; макеты; электрыфікаваныя стэнды; кінафільмы і дыяфільмы; тэлебачанне і радыё; магнітафоны і г. д.

**Выкарыстанне схем, графікаў, табліц, якія вычэрчваюцца на дошцы,** патрабуе ад выкладчыка ўмення выразна і акуратна рабіць чарцёж на дошцы. Чарцяжы не павінны быць груваскімі.

Іх трэба паслядоўна вычэрчваць на дошцы і гэтак жа паслядоўна тлумачыць. Студэнты пры гэтым набываюць графічныя навыкі і вучацца прыёмам графічнага адлюстравання думкі.

Кожная схема, графік, табліца павінны быць старанна прадуманы выкладчыкам, змешчаны ў самае зручнае месца на дошцы і не павінны перашкаджаць далейшаму выкладанню матэрыялу лекцыі на дошцы. Неабходна да мінімуму звесці праўку адлюстраванага на дошцы, пазбягаць сцірання ўжо нанесеных ліній. У адваротным выпадку ў канспектах у студэнтаў замест дакладнага малюнка будзе мазня.

Асобныя элементы малюнка на дошцы карысна рабіць, карыстаючыся каляровым мелам, аднак каляровы малюнак павінен быць яркім, добра бачным. Пры нізкай яго якасці лепш адмовіцца ад каляровага мелу.

Значэнне табліц нельга пераацэньваць. Калі патрэбная студэнтам табліца ёсць у адпаведных літаратурных крыніцах, то на лекцыі не варта яе поўнасцю вычэрчваць, а трэба паведаміць толькі прэдзельныя значэнні ўваходзячых у яе велічынь, адаслаўшы пры гэтым студэнтаў да першакрыніцы.

Неабходна мець на ўвазе, што сапраўднай нагляднасці пры выкарыстанні гэтай формы можна дабіцца пры сур'ёзных адносінах да мелу і дошкі. Нізкая якасць мелу, сухая, брудная анучка і дрэнная дошка звядуць на нішто гэтую форму нагляднасці.

**Схемы, графікі, табліцы і чарцяжы, зробленыя ў выглядзе плакатаў,** шырока распаўсюджаны ў навучанні. Мы сутыкаемся з такой з'явай, калі ў асобных выпадках узнікае неабходнасць выкладаць студэнтам пытанні, звязаныя з канструкцыяй новых узораў тэхнікі, матэрыяльная частка якіх яшчэ не паступіла на кафедру. Галоўным дапаможнікам у такіх выпадках з'яўляюцца плакаты, зробленыя на кафедры.

Плакаты шырока выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе і пры наяўнасці вывучаемай тэхнікі ў якасці дапаўнення да натуральных узораў.

Кафедра мае дастатковы плакатны фонд. Большасць плакатаў адпавядае прад'яўленым да іх патрабаванням: выкананы ў буйным плане, дакладна, вызначаюцца добра падабранай гамай колераў, з густам зроблены надпісы. Такія плакаты ўпрыгожваюць лекцыю выкладчыка і з'яўляюцца сапраўдным узорам нагляднасці.

Аднак бываюць і такія плакаты, якія б лепш не выкарыстоўваць у навучальным працэсе: яны маюць непрывабны выгляд, нестандартныя надпісы, некаторыя з іх зношаны, пажаўцелі, часам з памылкамі.

**Узоры вырабаў,** выкарыстоўваемыя на занятках, найлепшым чынам забяспечваюць нагляднасць навучання студэнтаў. Узор вырабу павінен быць дзейнічаючым, г. зн. забяспечваць максімальна магчымы паказ узаемадзеяння яго механізмаў і вузлоў у кінематычнай паслядоўнасці.

Важнейшае значэнне на занятках па вывучэнню тэхнікі мае дэманстрацыя яе дзеяння. Яна павінна быць бездакорнай, дакладнай. Зрыў тут недапушчальны. Дэманстрацыя можа здзяйсняцца асістэнтам, у ролі якога можа выступіць як лабарант, так і студэнт. Аднак выкладчык пры падрыхтоўцы да заняткаў сам павінен дасканала авалодаць усімі прыёмамі дэманстрацыі, каб у любы момант можна было замяніць асістэнта.

Варта сказаць, што на кафедры вядзецца вялікая работа па забеспячэнню гэтай формы нагляднасці як у аўдыторыі, так і ў палявых умовах.

**Разразныя вузлы.** Наяўнасць тэхнічна спраўных узораў канструкцый не выключае патрэбнасці ў разразных вузлах, якія дазваляюць зразумець сутнасць канструкцыі, перайсці ад агульнага прынцыповага ўяўлення аб канструкцыйнай схеме ўзору да цвёрдых ведаў кожнага вузла, кожнай дэталі складанай сучаснай тэхнікі.

Макеты — самая распаўсюджаная форма нагляднасці. Яны могуць быць простымі і складанымі, плоскімі і аб'ёмнымі. Асаблівую каштоўнасць набываюць макеты малагабарытных вузлоў, якія маюць складаную пабудову. Прыгатаванне такіх макетаў з празрыстага і рознакаляровага матэрыялу ў буйным маштабе значна паляпшае нагляднасць навучання і засваенне вучэбнага матэрыялу. Неабходна падтрымліваць і адобрываць ініцыятыву лабарантаў і студэнтаў у вырабе такіх наглядных дапаможнікаў. У гэтай галіне ў нас вялікія магчымасці для рацыяналізатараў, якія вельмі многа працуюць над удасканаленнем матэрыяльна-тэхнічнай базы кафедры.

**Электрыфікаваныя стэнды** часта выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання студэнтаў на кафедры. Як правіла, гэтыя стэнды добра аформлены, зроблены ў буйным плане. Электрыфікаваныя стэнды могуць мець ручное або аўтаматычнае кіраванне.

Важнай асаблівасцю такіх стэндаў з'яўляецца магчымасць здзяйсняць паказ дзеяння той ці іншай канструкцыі як за рэальны час работы, так і ў запаволеным тэмпе з магчымасцю ўвогуле спыняць дзеянне стэнда для фіксавання ўвагі студэнтаў на найбольш важных этапах работы.

Фонд электрыфікаваных стэндаў кафедры сістэматычна папаўняецца за кошт цэнтралізаванага забеспячэння і стварэння іх сіламі кафедры.

**Дыяфільмы і кінафільмы** забяспечваюць высокую ступень нагляднасці. У асобных выпадках дыяфільмы дазваляюць адмовіцца ад плакатаў. Дыяпраектары зручныя для выкарыстання ў навучальным працэсе і дазваляюць здзяйсняць дэманстрацыю дыяфільма без зацямнення аўдыторыі. Упраўленне паказам дыяфільма здзяйсняецца самім выкладчыкам з дапамогай кнопкі, якая знаходзіцца ва ўказцы. Тлумачэнні даюцца выкладчыкам у ходзе паказу. Працяглась паказу не павінна быць вялікай. Празмерная ілюстратыўнасць заняткаў шкодна. Нельга ж забываць, што студэнт павінен весці канспект, у якім у працэсе лекцыі павінен быць зафіксаваны неабходны матэрыял.

Вельмі карысна прымяніць у навучальным працэсе кінафільмы, асабліва на ўводных, заключных лекцыях, пры падрыхтоўцы тэхнікі да яе дзеяння і г. д. Стварэнне кінафільма — справа складаная, яна патрабуе высокай культуры выканання, дакладнай распрацоўкі сцэнарыя, наяўнасці ўзорнага абслугоўваючага персаналу і тэхнікі. Вось чаму стварэнне кінафільма высокай якасці пад сілу калектыву вопытных спецыялістаў.

За апошні час у навучальным працэсе кафедр пачынаюць укараняцца такія новыя формы нагляднасці, як тэлебачанне і радыё, а таксама гукавыя запісы. Гэта садзейнічае лепшаму ўспрыняццю і запамінанню студэнтамі выкладаемага матэрыялу і ажыўляе такія заняткі.

Нагляднасць навучання і прымяненне тэхнічных сродкаў у выкладанні —важнейшая ўмова паспяховага засваення неабходных студэнтам ведаў.

**І. ПРАДКО,**
**выкладчык.**

*З ГІСТОРЫІ УНІВЕРСІТЭТА*

# СТУДЭНТ, ВЫКЛАДЧЫК, ПІСЬМЕННІК

**Заява.**

Прашу прыняць мяне на II курс літаратурнага факультэта.

16. VII-43 г. Ів. Мележ.
г. Бугуруслан.

З гэтай невялікай заявы і пачынаецца сувязь Івана Паўлавіча Мележа з Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

У аўтабіяграфіі І. П. Мележ піша: «Мяне прынялі, і ў канцы кастрычніка сышоў я на пероне Казанскага вакзала ў Маскве, углядаўся ў суровае аблічча сталіцы на чацвёртым годзе вайны. Сходня— дачны пасёлак за Хімкамі — была нібы маленькім кутком Беларусі: усюды сустракаліся беларускія хлопцы і дзяўчаты, студэнты і партызаны, — душу цешыла беларуская гаворка. Гора і бяда, якія ішлі па роднай зямлі, тут чутны былі як нідзе; яны чуліся не толькі ў гаворках, — у шуме сходненскіх сосен і бяроз, такіх падобных на нашы, беларускія.

Для вучобы далі нам стары драўляны будынак на два паверхі, побач з чыгункай, па якой беглі цягнікі на Ленінград...».

Будучы сам студэнтам, Іван Паўлавіч адначасова выкладаў ва універсітэце ваенную падрыхтоўку. У 1943-44 гг. студэнту Мележу давялося быць яшчэ і загадчыкам кафедры ваеннай і фізічнай падрыхтоўкі, і сакратаром універсітэцкай партыйнай арганізацыі.

«Нялёгкае і цікавае жыццё было тут: паволі адзін за адным з'язджаліся студэнты, доўга звычайным быў такі малюнак, калі перад выкладчыкам сядзелі два-тры студэнты. Нярэдка можна было бачыць і такое: прафесара слухаў адзінадзіны слухач. Хлопцы і дзяўчаты не толькі вучыліся: па чарзе працавалі на кухні, у сталоўцы, якая радавала галаднаватых наведвальнікаў сваім цудоўным крапіўным баршчом, казалі, багатым надзвычай каштоўнымі вітамінамі. Ездзілі—разам з выкладчыкамі — у лес, нарыхтоўвалі самі дровы, пілавалі іх. Самі разгружалі вагоны з бульбай. Самі рабілі ўсё, нічому не здзіўляючыся, ні на што не наракаючы».

І вось там, на Сходні, у коле таварышаў, Мележ наважыўся прачытаць тыя свае апавяданні, якія былі напісаны калісьці ў палатах тбіліскага шпіталю. М. Р. Ларчанка, выкладчык беларускай літаратуры, параіў паказаць гэтыя апавяданні Кузьме Чорнаму. Яшчэ не зусім ачуняўшы ад цяжкай хваробы, слабаю рукою на дзвюх старонках Кузьма Чорны «разабраў плюсы і мінусы абодвух апавяданняў».Сустрэча з вялікім майстрам назаўсёды засталася ў памяці Івана Паўлавіча.

«Настрой у Сходні быў хоць і трывожны, але ўсё ж цудоўны: нашы войскі ішлі ўжо беларускай зямлёю — беларускім поўднем»,—успамінае пісьменнік.

Як толькі быў вызвален Мінск, БДУ пачаў збірацца ў дарогу. Універсітэт вяртаўся на вызваленую беларускую зямлю. Начальнікам эшалона, які павінен быў перавезці маёмасць універсітэта, быў назначан Іван Мележ. Вельмі цяжка было дабіцца тых вагонаў. Мележу нават у Ленінград па гэтай справе з'ездзіць прыйшлося. Але ўсё ж-такі дабіўся. Эшалон у хуткім часе быў пададзен на Сходню. Два тыдні вёз цягнік на радзіму універсітэцкія кнігі, абсталяванне, розныя прылады.

У цяжкім становішчы знаходзіліся будынкі універсітэта. Не было месца для вучобы. Студэнты рассяляліся дзе хто мог. Філфак размясціўся ў цяперашняй школе № 2 і ў будынку былога матфака.

1945 год быў апошнім годам студэнцкага жыцця Івана Мележа. Філфакаўцы пачалі здаваць выпускныя экзамены. Разам з Іванам Мележам здаваў экзамены яшчэ адзін шырока вядомы сёння беларускі пісьменнік Мікола Лобан. Ён, як і Мележ, здаў усе дзяржаўныя экзамены на выдатна.

У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР студэнты, якія закончылі універсітэт, атрымлівалі права на нашэнне нагруднага знака. Адным з першых — нагрудны знак № 2 — атрымаў яго Іван Мележ.

Скончан універсітэт. Як лепшаму студэнту Мележу прапанавалі паступаць у аспірантуру. У час вучобы Іван Мележ напісаў рэферат «Бытавыя беларускія казкі», які быў прызнан выдатным. Тэмай для кандыдацкай дысертацыі Мележ абраў творчасць Кузьмы Чорнага. На жаль, дысертацыя гэта не была напісана. Чаму? Сам пісьменнік адказвае на гэта так: «Замест яе напісаў некалькі кніжак прозы».

У маі 1945 года ў жыцці Івана Паўлавіча Мележа адбылася вялікая падзея — разам з Янкам Брылём і Паўлам Кавалёвым ён быў прынят у Саюз пісьменнікаў СССР.

Першы зборнік апавяданняў «У завіруху» выйшаў у 1946 годзе, калі Мележ яшчэ вучыўся ў аспірантуры.

У 1948 годзе Іван Мележ канчае аспірантуру. У тым жа годзе выходзіць з друку другая яго кніжка — «Гарачы жнівень».

Гаворачы пра універсітэт той пары, трэба адзначыць, што яго сувязь з беларускімі літаратарамі была безупыннаю. Так, напрыклад, 3 лютага 1946 года студэнты БДУ сустрэліся на вечары беларускай лірыкі з Петрусём Броўкам, Пятром Глебкам, Максімам Танкам, Кастусём Кірэенкам, Піменам Панчанкам. У тым жа годзе ва універсітэце адбыліся вечар памяці Максіма Багдановіча і вялікі вечар памяці Максіма Горкага. Сапраўднай падзеяй стаў вечар з удзелам беларускіх літаратуразнаўцаў і крытыкаў, прысвечаны 40-годдзю літаратурнай і грамадскай дзейнасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

Пакінуць літаратурную дзейнасць Мележ ужо не мог. Літаратура стала часткай яго жыцця, часткай яго самога. Але пісаць выпадала толькі па начах: у тыя гады пісьменніку даводзілася займаць адразу некалькі пасад. Ён працаваў у ЦК КПБ, быў літаратурным супрацоўнікам часопіса «Полымя»; а пасля заканчэння аспірантуры (1948 год) пачаў выкладаць беларускую літаратуру на філфаку БДУ.

1951 год. Упершыню ў перакладзе на рускую мову выходзіць кніжка Івана Мележа «Товарищи». Наогул творы універсітэцкага перыяду ў далейшым неаднаразова перакладаліся на замежныя мовы і на мовы народаў СССР. У тым жа 1951 годзе Мележ пакідае універсітэт і аддаецца поўнасцю літаратурнай працы.

І хаця І. П. Мележ даўно не працуе ва універсітэце, сувязяў з ім не парывае.

**У. ВАСІЛЕВІЧ,**
**студэнт III курса філфака.**



*УСПАМІН ЛЕТА.*
*Фотаэцюд Д. ЧАХОВІЧА.*

## ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Працягваецца падпіска на шматтыражную газету «Беларускі універсітэт». Спадзяемся, што вы будзеце сябрамі і падпісчыкамі сваёй шматтыражкі.

Кожны чацвер свежы газетны нумар чакае чытачоў.

Газета ў дзень выхаду дастаўляецца на факультэты. Патрэбную колькасць экземпляраў для кафедр можна атрымаць у аддзеле перыёдыкі універсітэцкай бібліятэкі.

Падпіску можна аформіць у грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку.

Рэдкалегія.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 08476 Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1341.